*воздух. Видимо, березок поблизости не было*» [Там же, с. 627]. Данный прием придает повествованию целостность и завершенность.

Таким образом, многообразие значений, которые выражаются при помощи одного приема – финального предложения-комментария, отражает мастерство З. Прилепина-писателя. Любить или не любить его творчество – выбор каждого, но отрицать наличие литературного таланта у автора невозможно.

**Литература**

1. В России появляются люди, готовые умирать за идею / Агентство политических новостей [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.zaharprilepin.ru/ru/pressa/sankya/apn-nn.html. – Дата доступа : 25.02.2020.
2. Данилкин Л. Захар Прилепин «Санькя». Мать без электричества / Л. Данилкин // Афиша. – 5 апреля 2006 г.
3. Прилепин Захар Взвод. Офицеры и ополченцы русской литературы. – М.: Издательство АСТ, 2017. – 736 с.

**V.V. Nesteruk**
Lomonosov Moscow State University Sevastopol Branch
e-mail: viky@ua.fm

### Comment as a Feature of the Individual Author's Style of Zakhar Prilepin

*Key words: commentary, irony, author's style, sarcasm, dialogueism.*

*The research is devoted to the role of single comments in a series of essays about Russian military writers as a characteristic feature of Zakhar Prilepin's individual author's style. The author analyzes the techniques for creating a dialogical situation and the comic means used by the author as integral features of commentary sentences.*

**В.Б. Нікіфарава**
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
e-mail: oniks30@gmail.com

УДК 821.161. 3 (092) Я. Брыль

## АКСІЯЛАГІЧНЫ ВЕКТАР У ТВОРЧАЙ ГІСТОРЫІ І ПРАБЛЕМАТЫЦЫ НІЗКІ ЛІРЫЧНЫХ МІНІЯЦЮР ЯНКІ БРЫЛЯ "ІСКРЫНКІ"

*Ключавыя словы: задума, творчая гісторыя літаратурнага твора, цыкл, лірычная нататка, мініяцюра.*

*Разглядаецца найбольш адказны этап творчай гісторыі цыклу лірычных мініяцюр Янкі Брыля "Іскрынкі". Выяўляецца вырашальная роля каштоўнасных арыенціраў аўтара ў фарміраванні і ўвасабленні задумы дадзенага мастацкага адзінства.*

Літаратурная спадчына Янкі Брыля дае шырокі прастор для вывучэння яе ў аспекце творчай гісторыі. У першую чаргу, дзякуючы самому аўтару, які ніколі не шкадаваў сіл і часу на ўдасканальванне сваіх твораў, і – ад самых першых крокаў у мастацтве – надзвычай адказна ставіўся да парадкавання і захавання рукапісных матэрыялаў. Не варта забывацца і на тое, што Я. Брыль адчуваў патрэбу пазнаёміць чытачоў з некаторымі падрабязнасцямі сваёй літаратурнай дзейнасці праз публікацыю лірычных запісаў у падборках "Свае старонкі" з характэрным падзагалоўкам "да творчай аўтабіяграфіі", а таксама "Служэнне", "З людзьмі і сам-насам", "З розных гадоў". Яны, можна сказаць, адкрылі дзверы ў творчую лабараторыю аўтара.

Падрыхтоўка Збору твораў пасля адыходу майстра актуалізуе тэксталагічнае даследаванне брылёўскай спадчыны і, зусім верагодна, паспрыяе цікавым знаходкам і адкрыццям. Бо пры бліжэйшым разглядзе відаць, што нават такое невялікае мастацкае адзінства, як "Іскрынкі", мае працяглую і зусім не простую творчую гісторыю. У сціслых рамках дадзенага артыкула абмяжуемся назіраннямі над самым значным этапам стварэння гэтага цыклу – паміж дзвюма яго кніжнымі публікацыямі.

У нізцы "Іскрынкі" Я. Брыль засяродзіў увагу на тэматыцы, з якой у канцы 1930-х гг. увайшоў у літаратуру і да якой вяртаўся на працягу ўсяго жыццёвага шляху: лад жыцця ў заходнебеларускай вёсцы, стасункі чалавека і прыроды, паэзія дзяцінства, выхаванне таленту. Ва ўвасабленні гэтых тэм пісьменнік заўсёды абапіраўся на аўтабіяграфічны досвед. Надзвычай выразна ён здолеў сканцэнтраваць увесь гэты мастацкі матэрыял у буйных творах – аповесцях і раманах ("Граніца", "Птушкі і гнёзды"), але нярэдка і "распырскваў", паводле ўласнага выразу, па мікражанрах – перш за ўсё па лірычных нататках.

Рашэнне сабраць некалькі запісаў у цыкл аўтар мог прыняць, калі заўважыў блізкасць трох занатаваных ім успамінаў пра хлапечыя прыгоды на гасцінцы паміж родная вёскай і мястэчкам.



Репозиторий ВГУ

Падставамі для аб’яднання зусім натуральна паслужылі падабенства прасторава-часавых параметраў, адзіны пункт погляду, агульная эмацыянальная дамінанта і нават скразны матыў бегу, які вельмі пасаваў да замалёвак са свету дзяцінства. “Весела трухаюць” [1, 339] за першым у іх жыцці аўтобусам вясковыя школьнікі, пакуль не ўскочылі ўнутр з дапамогаю добрага маўклівага дзядка (1). Сямігадовы герой на ўсё жыццё запомніў радасць перамогі пасля бегу, “няхай сабе і пястунскага” [1, 343], наўздагон маці (2). І “так здорава ляціцца ўніз, потым ідзецца, потна і радасна, зноў угару” [1, 346] на лыжнай прабежцы (3).

Менавіта ў такім парадку памянёныя лірычныя запісы былі аб’яднаны пад агульнаю назвай “Іскрынкі” з адзінаю датай “1989”. Верагодна, гэта час узнікнення і першай спробы рэалізацыі задумы цыклу, сутнасць якое Я. Брыль адкрыта выказаў у чацвёртым складніку нізкі:

“Падумаўшы, дык жа нічога ні асаблівага, ні надзвычайнага ні ў той кульбе з аўтобуса, ні ў той пагоні за мамай, ні ў самаробных падлеткавых лыжах – тым больш. У кожнага свае ўспаміны. Яшчэ і не такія, цікавейшыя, страшнейшыя…

Але ж пішу я не за кожнага, не за ўсіх – за самога сябе. Няхай сабе будзе, што старасць гэта – жывейшае вяртанне да найпершых успамінаў, няхай нават і сентыментальнасць, у нечым, сям-там. Але ж і просяцца яны, і добра бачацца, і паўтараюцца час ад часу – тыя іскрынкі, калі на тое пайшло, дык, можа, і найсвятлейшага, найсапраўднейшага чалавечага шчасця” [1, 346].

Як бачым, галоўнае імкненне аўтара – перажыць яшчэ раз і перадаць далей людзям, “каб жыло”, тое, што ён лічыў самым каштоўным. Гэта “найпершыя ўспаміны” маленства, а ў іх “іскрынкі <…> чалавечага шчасця”. Яны жывыя: самі “бачацца”, “паўтараюцца” і “просяцца” да чытача. Значыць, не варта браць пад увагу ацэнкі тых, хто пасмейваецца з “сентыментальшчыны”, папракае ў суб’ектыўнасці і нават у “суб’ектывізме”, бо ўнікальнасць досведу глыбокай цікавай асобы – гэта таксама каштоўнасць. Праілюстраваць гэтую ідэю з максімальнай выразнасцю пісьменнік спадзяваўся з дапамогаю аб’яднання мікратвораў у нізку. Метафара, абраная для яе агульнай назвы, таксама выяўляла аўтарскае замілаванне, высокую каштоўнасную характарыстыку.

Так у 1989 г. быў складзены цыкл з чатырох лірычных запісаў, які правамерна лічыць першай рэдакцыяй брылёўскіх “Іскрынак”. У такім выглядзе ён быў апублікаваны, напрыклад, у зборніку “Пішу як жыву” (1994). Дарэчы, у гэтай кнізе сустракаем таксама іншыя творы, арганізаваныя падобным чынам, напрыклад, “За светлую памяць” (1988). Аднак аўтар не застаўся задаволены і працягнуў дапрацоўку. Непасрэдным імпульсам, магчыма, стала цалкам зразумелае жаданне пашырыць маштаб комплексу за кошт твораў, блізкіх у ідэйна-тэматычных адносінах. І творы такія знайшліся. Напрыклад, у зборніку “Вячэрняе”, які ўбачыў свет у тым жа, што і “Пішу як жыву”, 1994-м годзе, падборка лірычных запісаў таксама пад назвай “Вячэрняе” адкрывалася тэкстам “Памёр Алесь Руляк, мой даўні сябар па кнігах, нашмат старэйшы за мяне настаўнік-пенсіянер. <..>” [2, 144], а на 175-м месцы змяшчала ў сабе нататку “Памятаю юначае чытанне, па-польску, “Станцыі Баранавічы” з цудоўнай канцоўкай – пажаданнем гэтай станцыі згарэць. <…>” [2, 213]. Неўзабаве яны разам з яшчэ чатырма тэкстамі ўдала занялі свае месцы ў “Іскрынках”.

Аднак на гэтым пісьменнік не спыніўся. Вырашэння патрабавала таксама праблема жанравага адзінства. Справа ў тым, што параметрам лірычнага запісу дакладна адпавядаў толькі чацвёрты складнік першай рэдакцыі цыклу. Творы, заснаваныя на дзіцячых успамінах, характарызаваліся адносна развітым падзейна-апавядальным пачаткам, а таму і большым аб’ёмам тэкстаў. Такія прыкметы ўласцівы не столькі запісу, колькі мініяцюры. Для поўнай жанравай адпаведнасці ім не хапала толькі назваў, якія, нібы ключавыя словы, мабілізавалі бы ўвагу чытача і вялі яе ад знешняй вобразнасці да ўнутранага, маральна-філасофскага сэнсу. Нельга не пагадзіцца з меркаваннямі аб тым, што назва – першая выразная прыкмета, якая адрознівае мініяцюру, дзе нейкі жыццёвы момант, назіранне не толькі злоўлены, але таксама эмацыянальна ды інтэлектуальна распрацаваны да гарманічнай паўнаты завершанай карціны, ад нататкі з яе спантаннасцю, імгненнай фіксацыяй думкі альбо пачуцця.

Пасля павелічэння колькасці складнікаў жанравы дысбаланс у новым адзінстве стаў яшчэ больш відавочным, і Я. Брыль ліквідаваў яго. У прыватнасці, згаданыя вышэй тэксты з “Вячэрняга” былі названы “Пісулька” і “Почырк”, тры творы з першай рэдакцыі “Іскрынак” адпаведна – “Дзядок” (1), “Пястота” (2) і “Гімнастыка” (3), а чацвёрты, адзіны тыповы запіс, быў зняты. Гэта пайшло нават на карысць цыклу, бо сутнасць яго задумы ўжо не была сфармулявана ў гатовым выглядзе, а паступова выяўлялася ў тэксце і падтэксце ўсяго комплексу твораў.

Цяпер цыкл “Іскрынкі” складаўся з дзевяці мініяцюр у наступнай паслядоўнасці: “Дзядок”, “Пястота”, “Дамаўнік”, “Глыбіня”, “Пехатою”, “Гімнастыка”, “Почырк”, “Здалёк”, “Пісулька”, і назвы твораў удала дапамагалі структураваць яго кампазіцыю. Так узнікла другая рэдакцыя нізкі, надрукаваная, у прыватнасці, у зборніку “Дзе скарб ваш” (1997). Датаванне, пашыранае да “1982 – 1994”, хутчэй за ўсё нагадвае аб тым, што складнікі былі напісаны ў розныя гады дадзенага



Рэпазіторый БДУ

інтэрвалу, дапрацаваны і кампазіцыйна размеркаваны ў адпаведнасці з аўтарскай задумай. У ёй захавала актуальнасць імкненне даверыць чытачам некалькі дарагіх сэрцу момантаў са сваіх дзіцячых успамінаў. Але разам з тым у пашыранай мастацкай прасторы другой рэдакцыі нізкі цэнтральнае месца відвочна заняла праблема аксіялагічнай арыентацыі асобы.

Лірычны герой у абодвух рэдакцыях "Іскрынак" уяўляе сабой сапраўдны аўтапартрэт Я. Брыля – сталага, дасведчанага чалавека, які ў 1980-х-90-х гг. вяртаецца ў думках да пачатку XX стагоддзя, калі ён быў хлопчыкам 7 – 14 год. Такая аўтакамунікацыя дазваляе сумясціць непасрэднасць дзіцячых уражанняў са змястоўнасцю рэфлексіі дарослага, "пункцірам" прасачыць пройдзены ім шлях эвалюцыі асобы і таленту.

Перабіраючы "найпершыя ўспаміны", лірычны герой з прыемнасцю адзначае ўстойлівасць сваіх жыццёвых прыярытэтаў. Узаемаразуменне пакаленняў, лад у сям'і, сяброўства, асалода чытання і самастойнай творчасці, захапленне красой чалавека і прыроды, – усё гэта сілкуе яго душу ўжо больш за шэсць дзесяцігоддзяў. Розніца толькі ў асаблівасцях перажывання ды ў глыбіні пранікнення ў сутнасць гэтых каштоўнасцей:

– Я і сёння яшчэ люблю сяды-тады, чым далей, то ўсё больш зрэдку, апынуцца на нашай гары. Калі адзін, дык моўчкі пастаю, паазіраюся, а калі з кім-небудзь госцем, бывае і замежным, дык і спытаюся: "Што, прыгожа?" А ў маленстве я ўмеў радасць ад вышыні яшчэ выказаць і крыкам – тонкім, пранозлівым, доўгім, – лепш за ўсіх сябрукоў і сяброўак [3, 40] ("Дзядок").

У адборы іскрынак-мініяцюр лірычны герой робіць акцэнт на тым, што ўяўляецца самым значным, вартым агульнай увагі – на першых праявах чалавечай індывідуальнасці хлопчыка. Нават калі, на думку дарослага, яны выглядаюць камічна: хоць па-пястунску, але дамогся свайго ("Пястота"); дзеля задавальнення цікаўнасці забыўся на ўсё, не разлічыўшы сілы і час ("Пехатою"); хацелі з пляменнікам-сябрам "як след падцягнуцца з вучобай" [3, 53] і ўрэшце сканцэнтраваліся на фізкультуры ("Гімнастыка"). Лірычны герой не страціў сувязі са светам дзяцінства. Таму ён з усмешкай і паблажлівай самаіроніяй гаворыць пра "выбрыкі" "заслужанага хатняга манюкі" [3, 46] ("Дамаўнік"), пра свавольствы школьнікаў на гасцінцы паміж вёскай і мястэчкам ці каля калодзежа, калі "два таварышы ўзялі мяне за ногі і апусцілі да вады" [3, 58] проста каб напіцца ("Здалёк"). З вышыні перажытага лірычнаму герою добра відаць, што было тут не толькі "маладзецтва", але і ўласцівая будучаму мастаку зачараванасць жыццём, яго рызыкай і таямніцамі: "Абавязкова спыняўся каля старога калодзежнага зруба і, з яшчэ аднаго каменя, што падстаўляўся для выцягнутага вядра, успінаўся так, што тварам перахільваўся за першае палена зруба. Зноў са сціхотнай цікаўнасцю заглядваў у сцюдзёную цемрадзь, вычэкваў, каб вочы прывыклі да яе настолькі, што вада ў бяздонні засвіціцца мне, і думаў так ці адчуваў, ці тое і другое разам, – такое глыбіні, мусіць, нідзе больш не бывае і не можа быць!.." [3, 48-49] ("Глыбіня").

Мудры дарослы разумее, што дзіця, цягнучыся да "чагосьці незвычайнага" [3, 59] ("Здалёк"), даверліва захапляецца знешнімі эфектамі. Так, юнаму самадзейнаму паэту адразу спадабаўся почырк Вовы Ядлінскага, "можа, нават прыгажэйшы за Бэркаў" [3, 56], але спатрэбіцца час, каб высветліць, хто з аднакласнікаў сапраўды варты даверу, каму можна было адкрыць свае першыя творчыя спробы ("Почырк"). Цікава, што ў згаданай мініяцюры дзіця марыць пра будучыню з "прадчуваннем шчаслівай перспектывы" [3, 55] самарэалізацыі ў літаратуры, а сталы мастак углядаецца ў сваё мінулае таксама ў пошуках "іскрынак шчасця". Лірычны герой згодны, што "бачыць самога сябе ў маленстве, здалёк, – гэта ўжо і пэўнае любаванне" [3, 57-58] ("Здалёк"). Але адразу падкрэслівае: "І не толькі сабой," – бо такое самапазнанне праз успаміны вядзе за сабою разнастайныя карціны жыцця, сведчанні гісторыі, постаці людзей, і ўсё гэта варта зацікаўленага разгляду, кранае душу.

Узнаўляючы свежыя, нязмушаныя ўражанні дзіцяці, прапускаючы іх праз сваё сённяшняе ўспрыманне, лірычны герой пераацэньвае мінулае. У выніку асабіста перажытае атрымлівае маштабнасць, узводзіцца на ўзровень агульнацікавага і значнага. Так, маленькі школьнік у мініяцюры "Дзядок", верагодна, у першую чаргу балюча (як у пераносным, так і ў простым сэнсе) перажываў свой няўдалы саскок на хаду з аўтобуса, а дарослы пісьменнік прапануе іншую выснову: "І ва ўспаміне гэтым бачу, адчуваю – як галоўнае – не тую крыўду і злосць за сваё кулянне падбітым зайцам услед за сумкай, не той, можа, і ўяўны смех, а перш за ўсё – працягнутую дужкай кульбу, а тады маўчанне дзядка, яго таямнічую, дабрадушную ўсмешку" [3, 42].

Дзіця сумавала з-за дробязей і радавалася ўсяму незвычайнаму, а сталы пісьменнік у эпізодах самага звычайнага жыцця шукае і з радасцю знаходзіць праявы чалавечнасці. На жаль, гэты ідэал, які для Я. Брыля заўсёды быў "вышэй за ўсё і перш за ўсё", у сучаснай рэчаіснасці на парозе XXI стагоддзя, у тлуме ды пагоні за камфортам заўважна траціць сваю каштоўнасць. З асаблівай выразнасцю гэта паказана ў мініяцюры "Пісулька". Аўтар аддаў ёй заключнае месца і такім чынам яшчэ больш акцэнтаваў хвалюючую праблему. Пры гэтым лірычны герой старанна стрымлівае эмоцыі, як быццам прапануе перш за ўсё не абурацца, а задумацца. Пасля смерці сябра, "праз паўгода



Рэпазіторый ВДУ

наведаўшы яго самотную ўдаву", ён не знайшоў значнай часткі Алесева архіва: "Я не сабраўся прыехаць раней, і гаспадыня паспела ўсе пісьмы спаліць. <…> Часта такое паўтараецца – спальванне, «чтобы не захламлять квартиру» <…>" [3, 60].

Як бачым, сітуацыя тыповая, але прызнаць яе нармальнай лірычны герой адмаўляецца. Для яго страчаныя назаўсёды лісты не "хлам", а каштоўныя сведчанні гісторыі: "А іх, я ведаю, было нямала. З такой далечыні, як Польшча, Англія, Аўстралія, ад сваякоў, якіх віхураю вайны разнесла па вялікім свеце, ну, вядома, і бліжэйшыя пісьмы, ад сяброў па навагрудскай беларускай гімназіі, ад іншых людзей, у тым ліку і мае, за ўсе пасляваенныя гады" [3, 60].

Аднак герой нават па маленькай запісцы (ён кажа пра яе "ацалела", як пра жывую істоту) здолеў узнавіць у памяці і аблічча "смуглявай, высокай, вясёлай красуні" Ані [3, 61], і шэраг карцін са сваіх школьных гадоў, і роздум пра выпрабаванні, што выпалі на долю заходнебеларускай моладзі напярэдадні і ў час вайны. Успамін пра "чэрвеньскі дзень ажно трыццатага года" [3, 61] поўніцца адчуваннем шчасця трынаццацігадовага хлапчука, які выканаў адказнае даручэнне, трапіў на развітальны вечар сямікласнікаў, быў зачараваны дзявочай красой і патаемна перажываў сваю закаханасць у Аню. Здаецца, такі ўспамін "праз цэлую вечнасць" [3, 63] утварае рэзкі кантраст з сучаснасцю, якая "сентыментальных" каштоўнасцей не шануе. Аднак лірычны герой не спяшаецца выносіць прысуд. Пашкадаваўшы, што "вось і тых пісьмаў няма", ён раптам задаецца пытаннем: "А зрэшты – ці сказалі б яны мне больш за гэтую пісульку?.." [3, 63]. Я. Брыль пакідае надзею на жывую памяць чалавека. У дасканалым літаратурным увасабленні яна здольна захоўваць і транслюраваць жыццёвы і гістарычны досвед як каштоўнасць асабістай і агульнакультурнай значнасці. Цыкл "Іскрынкі" гэта пераканаўча пацвярджае.

**Крыніцы**


1. Брыль, Я. Пішу як жыву. Аповесць, апавяданні, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 363 с..
2. Брыль, Я. Вячэрняе. Лірычныя запісы і мініяцюры / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 350 с.
3. Брыль, Я. Дзе скарб ваш. Лірычная проза / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1997. – 334 с.



**V.B. Nikifarava**
Yanka Kupala Grodno State University
e-mail: oniks30@gmail.com


**Axiological vector in the creative story and problematics of the cycle of lyric miniatures "The Sparks" by Yanka Bryl**


*Key words: idea, creative story of a literary work, cycle, lyric notation, miniature.*

*In the article the most important stage in the creative story of the cycle of lyrical miniatures "The Sparks" by Yanka Bryl is considered. The decisive role of the author's value guidelines in the formation and implementation of the idea of this artistic unity is revealed.*



**Г.В. Навасельцава**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: Novoseltseva.anna@mail.ru



УДК 821.161.3-31.09


## МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ АСОБЫ І ЛЁСУ ТВОРЦЫ Ў РАМАНЕ «РЭВІЗІЯ» АНДРЭЯ ФЕДАРЭНКІ


*Ключавыя словы: раманная сітуацыя, эстэтычная стратэгія, мастак слова, іншасказальнасць, «Я»-раман.*

*У артыкулу аналізуецца праблемна-тэматычная і жанрава-стылёвая спецыфіка рамана «Рэвізія» Андрэя Федарэнкі. У вобразнай сістэме твора вызначаецца галоўны герой, прататыпам якога выступае сам аўтар. Пісьменнік асэнсоўвае месца і ролю творцы ў айчынным літаратурным працэсе, дае крытычныя ацэнкі вядомым літаратурным вобразам, выяўляе свае эстэтычныя прынцыпы. Відавочны прыярытэт аддаецца нацыянальна адметнаму індывідуальнаму характару, сцвярджаецца мастацкая значнасць увагі да духоўнага свету асобы.*


У беларускім рамане на мяжы стагоддзяў вядуцца актыўныя творчыя пошукі, скіраваныя ў тым ліку на выяўленне эстэтычных мажлівасцяў «Я»-апавядальнай стратэгіі. Прыгодніцкія элементы шырока выкарыстоўваюцца ў рамане «Рэвізія» (1987, 1992, 2003) Андрэя Федарэнкі, дзе прыём сну, паралельнага, часам кантрастыўнага, развіцця сюжэта, феномен «раздвойвання» асобы галоўнага героя, пераважна суб'ектыўнае пісьмо выяўляюць адметную эстэтычную спецыфіку «Я»-рамана. Праз светасузіранне галоўнага героя Алеся Трухана ў агульных рысах паказваецца




Репозиторий ВГУ